УДК 94(476)

# РЭПРЭСАВАНЫЯ ПАЭТЫ – ВЫПУСКНІКІ МАГІЛЁЎСКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ТЭХНІКУМА

***М. А. Дрыга*** (СГК МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. Г. Карсакоў,***
выкладчык

Магілёўскі беларускі педагагічны тэхнікум быў адкрыты ў 1923 г. Установа месцілася па адрасе Быхаўская, 18, у былым будынку жаночага епархіяльнага вучылішча (сучасны будынак Ліцэя № 1). Са сценаў педтэхнікуму выйшлі шмат творчых людзей, сярод іх паэты Сяргей Фамін, Юрка Лявонны, Васіль Каваль. Нажаль, іх лёс склаўся трагічна.

С. Фамін скончыў педтэхнікум у 1925 г., у той жа год быў прыняты ў літаб'яднанне «Маладняк». У 1935 г. быў арыштаваны па абвінавачванню ў антысавецкай дзейнасці, прыгавораны да 10 год зняволення, ў 1941 г. паўторна абвінавачаны, прыгавораны да растрэлу [1].

Ю. Лявонны (сапр. імя: Леанід Мікалаевіч Юркевіч) скончыў педтэхнікум у 1927 г. (або 1928 г.). Друкавацца пачаў у 1925 г., у той жа год уступіў у аб'яднанне «Маладняк». Выдаў шэраг зборнікаў паэзіі і нарысаў, разам з Сяргеем Грахоўскім пераклаў на беларускую мову раман Жуля Верна «20000 лье пад вадой». Некаторыя вершы Ю. Лявоннага былі пакладзены на музыку. У 1937 г. быў арыштаваны і асуджаны пазасудовым органам НКУС да вышэйшай меры пакарання [1].

В. Каваль (сапр. імя Васіль Пятровіч Кавалёў) у 1925 г. вучыўся ў педтэхнікуме, у той жа год прыняты ў «Маладняк». Выдаў некалькі зборнікаў вершаў і прозы, займаўся перакладамі. У 1936 г. арыштаваны па абвінавачванні ў антысавецкай дзейнасці, прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

Ю. Лявонны і В. Каваль былі расстраляны 29 кастрычніка 1937 г. у турме НКУС у Мінску [1].

У 1957 г. усе тры паэты былі рэабілітаваны. Вярхоўны суд СССР адмяніў іх прыгаворы за адсутнасцю складу злачынства. Аднак іх творы працяглы час не друкаваліся, у нашы часы іх імёны вяртаюцца ў беларускую літаратуру.

**Литература**

1. Знаменитые выпускники // Социально-гуманитарный коллеж [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://sgk.msu.by/index.php/kolledzh/nashi-vypuskniki/94-nashi-vypuskniki. – Дата доступа: 16.03.2020

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова